Газета дзяржаўнай установы адукацыі
"Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа"



# Перапынак!



№2
Кастрычнік, 2021

Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

## Чытайце ў нумары:



Дзень настаўніка стар. 2

Дзень маці стар. 3

Сябруем са спортам стар. 4

Працоўныя традыцыі стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# Дзень настаўніка

Дзень настаўніка адзначаецца ў Беларусі ў першую нядзелю кастрычніка. Ва ўсе часы ўвесь гонар настаўніка - у вучнях, у росце пасеяннага ім насення. Да прафесіі настаўніка ставіліся і ставяцца паважліва, і з удзячнасцю. Настаўнік - гэта адзін з галоўных узораў, на якія арыентуецца вучань ў перыяд сталення. Настаўнік - гэта заўжды асоба, якая не толькі дае веды, але паказвае прыклад годнасці і сумлення будучым пакаленням. Настаўнік - гэта ўзор дабрачыннасці, чалавекалюбства і мудрасці.

Прафесійнае свята — добрая нагода сказаць словы віншавання, пажадання, ўдзячнасці.














# Дзень маці



*Без сонца няма шчасця,*
*без жанчыны няма кахання,*
*без маці няма ні паэта,*
*ні героя.*
*Увесь гонар свету–ад маці.*
*Максім Горкі*

У нашай краіне дзень маці адзначаюць штогод 14 кастрычніка. Ніхто не любіць, нас так, беззапаветна і дакладна, як мама. Яна дае нам першыя ўрокі маральнасці і духоўнасці, дабрыні і пяшчоты.

Не абыйшло свята і нашу ўстанову. Класныя гадзіны, выставы літаратуры і малюнкаў, выраб падарункаў, святочны канцэрт – вось невялікі пералік мерапрыемстваў нашай установы, прысвечаных гэтаму святу.

Беражыце сваіх мам! Яны самыя лепшыя ў свеце!











# Сябруем са спортам

Здароўе — адна з галоўных каштоўнасцей для кожнага чалавека. І добра, калі вучні гэта разумеюць і выбіраюць спорт ды актыўны адпачынак, для яго ўмацавання. Прыемна бачыць, што на адной пляцоўцы – дзеці рознага ўзросту, і зусім не дзіўна, што малодшыя хочуць таксама быць спрытнымі і дужымі, як іх старэйшыя сябры па камандзе. А на школьным стадыёне месца знойдзецца ўсім. І не трэба сумаваць, думаць, чым заняцца, куды пайсці – у любы час, у любое надвор’е вы можаце адпачыць разам з намі, карысна і займальна правесці свой вольны час.

*Займайцеся спортам,   замацоўвайце сваё здароўе!*











# Працоўныя традыцыі

Шмат даўніх і слаўных традыцый існуе ў нашай установе. Адна з іх - сумесная праца па навядзенні парадку ў школе, родным аграгарадку. А цудоўнае асенняе надвор’е, сведчыць аб тым, што справу мы робім карысную і патрэбную. Гэта выдатны спосаб праявіць клопат аб сваёй малой радзіме, захаваць яе прыгожай і ўтульнай. Прыемна бачыць вынік сваёй працы, тым больш, калі кожны ўнёс у гэтую справу часцінку свайго цяпла. Толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам захаваць і ўмацаваць парадак на нашай Зямлі.













# Весткі з дзіцячага сада

Месяц кастрычнік праляцеў хутка і весела. Мы віншавалі са святам сваіх матуль, вучыліся бяспечным паводзінам, дружна канструявалі і разам весела гулялі.












